Modern History Archives
Archiû Najnoŭšaje Historyi
Fond 1/11 sprava 68

# СТУДЭНСКАЯ ДУМКА

ВОРГАН ЗАДЗІНОЧАНЬНЯ БЕЛАРУСКІХ СТУДЭНТАЎ

№2
1990

## ! ЧЫТАЙЦЕ

ДЗЕНЬ ДОБРЫ, БРАЦЕ !

Мы з табою,дзякуй Богу,дажылi ўжо да тых гадоў,калi нас вядзе свой розум.Але нас з табою трымаюць.Трымаюць малая стыпэндыя /без бацькоў мы – жабракi,а з бацькамi ўжо сорамна/, грымусовае разьмеркаваньне /могуць i ў чужы Сыбiр,могуць i пад свой Чарнобыль – маўляў,дзецi там жывуць,дык вучыце,кармiце,мыйце,нараджайце й сваiх/,жыцьцё па-савецку /па-пяцёх у пакоi замест трох/,якасьць адукацыi /з нашым дыплёмам...эх,Канада.../.Камсамол i прафсаюзы ўна не ахоплiваюць усiх нашых праблемаў,а ў тым,што ахапiлi – клопату пра нас ды зацятасьцi ў адстойваньнi нашых праблемаў мы таксама ня бачым.А хочаш жыць больш-менш прыстойна — трэба лiсьлiвiць,быць "актывiстам",старастам, маўчуном i г.д.Бязвер'е ,абыякавасьць да ўсяго i ўсiх,заняпад культуры i духоўнасьцi,адчужанасьць i варожасьць,забыцьцё маральных каштоўнасьцяў,пакiнутых нам у спадчыну продкамi- нашаму пакаленьню давядзiцца зьбiраць гэтае журботнае жнiво.Сыстэма прымушае нас моўчкi класьцiся ў ейную "будову".

Але Чалавек – ня сродак,а мэта.i мэтай,якая аб'яднае нас,можа быць толькi адно – выхаваньне новай,свабоднай i сьвядомай гэнэрацыi,якая здольная сама зрабiць выбар i не дазволiць праводзiць над сабой безадказныя сацыяльныя эксперымэнты.

Нi свабоды,нi правоў нi хто нам ня можа даць,калi мы самi не запатрабуем iх.Нам будаваць дэмакратычнае грамадзтва,нам адраджаць нацыянальную культуру,нам проста жыць.Таму галоўны напрамак нашае дзейнасьцi – ахова жыцьцёва важных iнтарэсаў студэнства,iнфармацыйны абмен,узаемадапамога i салiдарнасьць,прававая асьвета i заканадаўчая iнiцыятыва.

Нарэшце,ня будзем забываць,што мы маладыя, а гэта значыць – нашыя сэрцы адчыненыя для сяброўства.Наш саюз – гэта кантакты са студэнтамi ўсяго сьвету,гэта новыя сустрэчы i сябры,гэта магчымасьць цiкава пражыць маладыя гады.

Мы заклiкаем студэнтаў,а таксама ўсiх навучэнцаў дзейнiчаць.Гiсторыя дае нам шанц,i мы павiнны яго выкарыстаць.Памятайце – разам мы дужыя i вольныя.

ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ !

ЛІСТ ДА СЯБРУКА

## нашы КААРДЫНАТЫ

МЕНСК МЕНСК МЕНСК МЕНСК МЕНСК

БПi – Скрыган Юрась: тэл. 31-03-20
БДТМi – Перапечын Уладзя:мастацка-прамысловы ф-т i курс 3 група.
БДУ – Градоўкiн Сяржук: тэл. 23-09-70 юрыдычны факультэт.
– Сугоўдзь Вадзiм: тэл. 59-66-12 гiстарычны факультэт.
БТi – Вайтусёнак Алесь: тэл. 29-54-03
МДМi – Салошкiн Зьмiцер: тэл. 31-09-56
МДПi – Пятроўскi Юрась:вул.Артылерыстаў 12 пакой № 217 фiлялягiчны факультэт.
Рэдакцыя "Студ. Думкi"
– Чайцяховiч Зьмiцер: тэл. 31-73-70

БРЭСТ БРЭСТ БРЭСТ БРЭСТ БРЭСТ

Адрэсы:
– Бараноўскi iгар: iнд.224013 вул. Набярэжная 22 – 78 .
– тэл. 2-24-98 вул. Савецкай Канстытуцыi 5 – 113 .

ГОМЛЯ ГОМЛЯ ГОМЛЯ ГОМЛЯ ГОМЛЯ

– Саладоўнiкаў Андрусь: тэл. 55-79-03

ГАРОДНЯ ГАРОДНЯ ГАРОДНЯ ГАРОДНЯ ГАРОДНЯ

– Масько Едрусь: вул. Даватара 27 – 113

МАГiЛЁЎ МАГiЛЁЎ МАГiЛЁЎ МАГiЛЁЎ МАГiЛЁЎ

– Сярдзюкоў Алесь: тэл. 44-41-90 служб.

ПРАЦЯГ НА СТАР. 4.

# СТУДЭНСКАЯ ДУМКА

## МАЯ МІ(ПА)ЛІЦЫЯ....

Ц1 спрабавал1 вы зраб1ць параўнальны анал1з дзейнасьц1 нашай м1л1цы1 з,скажам,пал1цыяй Сан-Францыска? Кажаце ўсе паказальн1к1 бу-

# Вандэя—

дуць ня ў нашую карысьць? Ды,не .Памыляецеся. Ня тольк1 спаймаюць злодзея,але й перахопяць яго пры зьдзяйсьненьн1 злачыннага акту - вось на што здатныя нашыя доблесныя праваахоўныя органы.

25 сакав1ка г.г. а 12 гадз1не на Лен1нск1м праспэкце,ля Дому друку напагатове стаял1 некальк1 машынаў.Чакал1 яны ня доўга.Вось 1 ён, чыё прозьв1шча стала ў Менску пагалоскай:Пушк1н........У белай вышыванай кашул1,зь белым сьцягам,на як1м чырванеў закл1к "Ад Беларус1 калян1яльнай да Беларус1 незалежнай", выйшаў ён на сярэдз1ну праспэкту 1 адразу быў папярэджаны:нельга парушаць прав1лы дарожнага руху. Не падзейн1чала... 1 перад натоўпам зац1каўленых наз1ральн1каў ды разявакаў,пад наглядам дзьвух в1дэакамэраў была праведзена шпкоўная апэрацыя па затрыманьню 1 абясшкоджаньн1 небясьпечнага злачынцы - студэнта-дыплёмн1ка з тэатральна-мастацкага 1нстытуту.Злачынца аказаў супрац1ўленьне.Але ўстояць аднаму супраць мноства сабраных для поўнай гаранты1 м1л1цыянэраў ня здолеў.Апэрацыя была пасьпяхова закончаная.Для гэтага спатрэб1лася ўсяго некальк1 хв1л1наў.Малайцы!Дагнал1?-Не!Перагнал1 сан-францыскую пал1цыю.Але хочацца спытаць,ц1 ня сорамна было вам,маладым людзям у м1л1цэйскай форме,самым нетактоўным 1 гвалтоўным чынам на вачох зьдз1ўленага натоўпу разыгрываць спэк-

# —Прававая

такль з зап1хваньнем хлопца ў машыну 1 прылюдным зьн1шчэньнем лёзунгаў,у сэнсе як1х вынат не разабрал1ся.1 гэткае здарылася пасьля вуснага дазволу т.Валодзьк1най зь Менгарвыканкаму.Што ж каштуюць тады словы аф1цыйнай партыйнай асобы?

Але болей пужае 1ншае.Згаданы выпадак - тольк1 адз1н з мноства 1ншых,кал1 парушал1ся правы грамадзянаў нашае дзяржавы,што выразна праяўляецца 1 на "звышдэмакратычных" выбарах у Дзяржаўную Раду Беларус1,1 кал1 на вул1цах адбываюцца мерапрыемствы,як1я нясуць пагрозу недатыкальнасьц1 нашай "пан1" - камун1стычнай парты1. Ф1зычнае 1 маральнае ганьбаваньне чалавека непрыймальна для прававой дзяржавы,ну а кал1 прыймальнае ў нас,то хочацца спытаць, у якой кра1не мы жывём?

# !СА СЬВЯТАМ!

ВЯЛІКДЗЕНЬ

ХРЫСТОС ВАСКРОС!

Хрыстос васкрос!..Усюды радасць,
Усё глядз1ць смялей,святлей;
Вял1к1 мучальн1к,здаецца,
Абняў ус1х ласкаю сваей.

Хрыстос васкрос!..Неўгамонна
Плыве па н1вах,пушчах кл1к,
Плыве адна святая думка
З канца ў канец,як свет вял1к.

Хрыстос васкрос!..-пяе селян1н
З сваёй убогаю раднёй,
Забыўшы песн1 аб прадвесн1,
Забыўшы ўсё ўсёй душой.

Хрыстос васкрос!-пяе с1ротка,
Слуга,таптаная людзьм1;
Пяе ў чужыне падарожны,
Забыты бл1жн1м1 сваім1.

Хрыстос васкрос!-пяюць 1 тыя,
Хрыста згуб1ўшыя сыны,
Што ўц1хамолку куюць путы
Для нашай беднай стараны.

Хрыстос васкрос!..К табе,о божа,
1 я ў дзень гэты просьбу шлю:
Хай Беларусь,мая старонка,
Уваскрэсне к вольнаму жыццю!

Я.КУПАЛА

ВЯЛІКДЗЕНЬ

СТУДЭНСКАЯ ДУМКА



# Гісторыя КПСС

## нашы справы

У М1Н1СТЭРСТВА НАРОДНАЕ АДУКАЦЫ1 БССР

АД СТУДЭНТАЎ 1 ВЫКЛАДЧЫКАЎ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАЎ БЕЛАРУС1

АДКРЫТЫ Л1СТ.

У кра1не 1дзе працэс абнаўленьня, партыя прызнае стварэньне шматпартыйнае сыстэмы, пераглядаюцца старыя застойныя прынцыпы, а ў той жа час у навучальных установах гэтыя "прынцыпы" адыгрываюць к1руючую ролю. Студэнты працягваюць вывучаць г1сторыю КПСС, навуковы камун1зм, маркс1сцка-лен1нскую ф1лязоф1ю, навуковы атэ1зм, пал1тычную г1сторыю XX стагоддзя 1 1нш. Мы выступаем за дэ1дэялёг1зацыю 1 дэпал1тызацыю адукацы1, а таму

ПАТРАБУЕМ:

1. вывесьц1 грамадзк1я дысцыпл1ны /г1сторыя КПСС, навуковы камун1зм 1 1нш./ з шэрагу вядучых прадметаў 1 ўвесьц1 ў курс факультатыўных прадметаў, як1 ў роўнае ступен1 адлюстроўвалі бы вядучыя 1дэялёг11 ды пал1тычныя плын1 сьвету;
2. дэ1дэялёг1зацы1 1 дэпал1тызацы1 спэцыяльных дысцыпл1наў;
3. увесьц1 ў навучальных установах выкладаньне факультатыўнага курсу "Г1сторыя 1 культура Беларус1".

За кошт скарачэньня гадз1наў на вывучэньне вышэйзгаданых прадметаў мы патрабуем павял1чыць аб'ем заняткаў па спэцыяльных прадметах 1 прывесьц1 зьмест Вучэбнага працэсу ў навучальных установах у адпаведнасьць зь 1хным1 назовам1.

Чалавек пав1нен быць вольным ад 1дэялёг1чнага 1 пал1тычнага п1ску.

ВОЛЮ ТВОРЧАСЬЦ1 !

14 сакав1ка 1990 году.

Задз1ночаньне
Беларуск1х
Студэнтаў.

| Прозьв1шча, 1мя | Подп1с | Адрэса ц1 мейсца працы |
|---|---|---|

УВАГА!

УВАГА!

УВАГА!

1ДЗЕ ЗБОР ПОДП1САЎ. ДАЛУЧАЙЦЕСЯ ДА ГЭТАЙ СПРАВЫ! НЯХАЙ НЕ АБМ1НЕ ЯНА АН1ВОДНАГА СТУДЭНТА! Л1СТЫ МОЖНА АТРЫМАЦЬ, ПАТЭЛЕФАНАВАЎШЫ Ў РЭДАКЦЫЮ "СТУД. ДУМК1", АЛЬБО ПА КАНТАКТНЫХ ТЭЛЕФОНАХ Ц1 АДРЭСАХ У АБЛАСНЫХ ЦЭНТРАХ БЕЛАРУС1!

# ПЕРШЫЯ КРОКІ ЗБС

24 сакав1ка г.г. прыкладна каля 50 асобаў/разам зь дзецьм1 з навакольных дамоў/студэнтаў,талакоўцаў 1 вольных памагатых насупроць лякарн1 хуткай дапамог1 высадз1л1 гаёк з 300-350 дрэўцаў.Гэта была першая канкрэтная акцыя нашага Задз1ночаньня,яна прайшла пад назовам:"Дзень зямл1.Дрэва незалежнасьц1".1дэю падобнай акцы1,выказанай на глябальным экалягічным форуме ў Маскве,падхап1ў 1гар Куталоўск1 /:Сьв1танак" БТ1/,як1 адначасова ўваходз1ць у Каардынацыйную Раду Маладзёжнага экалягічнага руху."Белая Русь".Дзякуючы адм1н1страцы1 БТ1 1 Негарэльскага вучэбна-вопытнага лясгасу таго ж 1нстытуту пасадковы матэр'ял быў дастаўлены ў Менск 1 стаў гаем. На гэтую ж акцыю прыпадае першае выкарыстаньне сьцягу ЗБС.Ус1м дзякуем!

З прычыны адмены м1тынгу БНФ,прызначанага на 25 сакав1ка г.г. а 14 гадз1не, акцэнт сьвяткаваньня быў перанесены на пляц Вол1. Там па 1н1цыятыве ЗБС на дом,у як1м адбылося абвяшчэньне БНР,пад бел-чырвона-белым сьцягам была сымбал1чна ўстаноўленая памятная шыльда прыгожага вырабу з 1нфармацыяй аб меўшай тут, 72 гады таму,мейсца падзе1.Прысутныя ўсклал1 кветк1 1 прасьпявал1 шэраг патрыятычных песьняў.В1дов1шча выкл1кала вял1кую ц1кавасьць 1 шоўшых м1ма людзей:у коле м1л1цы1 1 спэцназу стракатае мора сьцягоў - беларуск1х,ЗБС,Эстон11;лёзунгаў - на лац1нскае мове,па-беларуску лац1нкай 1 к1рыл1цай.Пасьля м1л1цыя была вымушаная даць шлях калёне,якая перайшла ў парк Янк1 Купалы,дзе яшчэ некальк1 гадз1наў сьпявала,гукала вясну,таньчыла 1 гуляла ў беларуск1я гульн1.

СТУДЭНСКАЯ ДУМКА

ДЛЯ ВАС, СТУДЭНТЫ ТОЛЬКІ ПА ПЯТНІЦАХ

Зь л1пеня 1989 г. кал1фарн1йск1 адзьдзел БАЗу /ЗША/ пачаў выдаваць часап1с "BIELORUSSION REVIEW" /Беларуск1 агляд/.Ён выходз1ць адз1н раз на квартал па-ангельску.

# ІНФАРМАЦЫЯ-АБ'ЯВЫ

Часап1с складаецца з наступных галоўных рубрык:

1. Крон1ка падзеяў на Беларус1 /ад апошн1х 10 гадоў/.
2. Актуальныя праблемы:родная мова,чарнобыльская трагедыя,стал1нск1я злачынствы /Курапаты/, экалег1я.
3. Агляд заходняга друку,як1 п1ша пра Беларусь.
4. Беларусы па-за межам1 рэспубл1к1.

Адрэса рэдакцы1: "BIELORUSSION REVIEW", P.O. BOX 10353 TORRANCE CA. 90505 USA.

Увага!!! Студэнты маюць 1льготу - атрымл1ваць часап1с задарма.Вам застаецца тольк1 паведам1ць свае каардынаты ў вышэйзгаданую адрэсу рэдакцы1.

Паводле газэты беластоцк1х беларусаў "Н1ва".

У Дзяржаўным Мастацк1м Музэ1 /вул.Лен1на 20/ мы прачытал1 вось такую абвестку:

"Загадам м1н1стра культуры БССР за № 186 ад 8 сьнежня 1989 году пятн1ца абвяўляецца днём вольнага наведваньня асобным1 экскурсантам1".

Запрашаем студэнтаў скарыстаць гэтую магчымасьць 1 задарма натал1ць прагу да мастацтва.




ПРОС1М ПРАБАЧЭНЬНЯ,АЛЕ РАЗРЭКЛЯМАВАНЫ НАМ1 ГАРАДЗЕНСК1 РОК-ФЭСТ "РОК-КРОК" ПЕРАНОС1ЦЦА НА НЕВЯДОМЫ ПАКУЛЬ ТЭРМ1Н.ВЕЛЬМ1 ШКАДУЕМ РАЗАМ З ВАМ1!

## --РЭКЛЯМА--

Набраўшы пасьля 21 г-ны вечара тэл.61-82-13 1 спытаўшы Андруся Клюн1на,Вы маеце магчымасьць замов1ць яму наступныя музычныя зап1сы:

- Данчык /2-ве апошн1я кружэлк1 - па 45 хв-н/
- Сяржук Сокалаў-Воюш /"Кас1нерск1 цыкл"-45х/
- Алесь Камоцк1 /90 - хв1л1наў зап1саў/
- Вольга Цярэшчанка /40 - хв1л1наў зап1саў/
- рок-гурт "Мроя" /1987г. 1988/89г.г. па 30 /
- рок-гурт "Ул1с" /1989г. - 45 хв1л1наў/
- рок-гурт "Бонда" /1987г. - 45 хв1л1наў/

Перадаючы Андрусю касэту альбо дасылаючы яе яму,пакладз1це ў сярэдз1ну паперку са сва1м прозьв1шчам,адрэсай /тэлефонам/ 1 замоўленьн1 в ыканаўцам1.Тэрм1н зап1су 1-10 дзен.

КАЛ1 ЛАСКА !!!

## НАШЫ КААРДЫНАТЫ: !!!

В1ЦЕБСК В1ЦЕБСК В1ЦЕБСК В1ЦЕБСК В1ЦЕБСК

- Сьвятлана: тэл. 1-51-37
- Глаз Валера: Маскоўск1 пр-т дом 70, корпус 1, пакой 110.

## ЗРАБІЦЕ СВОЙ ВЫБАР!

Рэспубл1канская рада ТБМ 1мя Скарыны вылучыла кандыдатам у Менск1 гарсавет студэнта г1стфака.БДУ В1тушку Сяржука/ "Талака",ЗБС/.Ён балатуецца па 3 Ун1вэрсытэцкай акрузе/вул. Кастрычн1цкая ,Сьвярдлова №1 1нш./Сярод 4400 выбаршчыкаў гэтае акруг1 абсалютная большасьць студэнты БДУ 1 БТ1.

Калег1,закл1каем 22 красав1ка галасаваць за нашага хлопца!

Тых,хто зац1кав1ўся студэнтскай справай,тых, хто мае што сказаць 1 хоча падзял1цца сва1м1 думкам1 на старонках нашае часап1с1 з друг1м1 студэнтам1,запрашаем зьвязацца з нам1 па кантактным тэлефоне: 31-73-70,Кл1каць Вайцяхов1ча Зьм1цера.

Дзякуем аўтараў артыкулаў зьмешчаных у нумары!

Нумар падрыхтаваны 1-5 красав1ка 1990 року.
Друкуецца накладам 5000 экз.
У падрыхтоўцы нумару ўдзельн1чал1:1гар М1хно Вайцяхов1ч Зьм1цер ды 1нш.